ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**

**ЗАГАД**

05.01.2026 № 1

г. Гомель

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

**ПРИКАЗ**

г. Гомель

О проведении республиканского конкурса юных экскурсоводов музеев учреждений образования

В соответствии с письмом Министерства образования Республики Беларусь от 12.12.2025 № 06-01-14/14750/дс «Аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі», с целью формирования у обучающихся гражданско-патриотических чувств средствами экскурсионной музейной деятельности ПРИКАЗЫВАЮ:

1. Организовать проведение республиканского конкурса юных экскурсоводов музеев учреждений образования (далее – конкурс) в соответствии с Положением (приложение 1).

2. Ответственность за организацию и проведение областного этапа конкурса, представление конкурсных материалов на республиканский этап в сроки, указанные в Положении, возложить на директора государственного учреждения образования «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи» (далее – Центр туризма и экологии) Морозова А.Л.

3. Утвердить состав организационного комитета, жюри конкурса (приложение 2, 3).

4. Руководителям отделов образования райисполкомов, отделов образования спорта и туризма администраций районов г. Гомеля, управления образования Гомельского горисполкома, учреждения образования «Гомельский государственный областной лицей»:

4.1. организовать проведение районного (городского) этапа республиканского конкурса, обеспечить участие в областном этапе в соответствии с положением;

4.2. направить до 23 февраля 2026 г. для участия в областном этапе конкурса на электронный адрес краеведческого отдела Центра туризма и экологии kraeved-tur@gomelcte.by:

Зак. 018501-022000

заявку установленной формы (приложение 4) со ссылками на видеозаписи двух экскурсий от каждого профиля музея (экскурсия «три причины посетить музей» – до 5 минут, обзорная экскурсии с элементами театрализации от имени исторической личности – до 7 минут), которые проводит 1 экскурсовод в соответствии с п.2.5 Положения;

протоколы заседания жюри с количественным анализом участников региональных этапов.

5. Контроль за исполнением приказа возложить на заместителя начальника главного управления образования Ковалеву Е.Г.

Начальник главного
управления образования Р.И.Смирнов

Заместитель начальника
главного управления образования
Е.Г.Ковалева

Заместитель начальника отдела
воспитательной и социальной работы
Е.Н.Моторина

Дробов
Слаута 262272

Приложение 1
к приказу начальника главного
управления образования
от 05.01.2026 № 1

*Приложение к письму Министерства образования Республики Беларусь*
*12.12.2025 № 06-01-14/14750/дс*

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні рэспубліканскага
конкурсу юных экскурсаводаў
музеяў устаноў адукацыі

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Палажэнне аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі (далей – конкурс) распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення адукацыйных і іншых мерапрыемстваў з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2025 г. № 162.

1.2. Арганізатарам правядзення конкурсу з'яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне ажыццяўляе Установа адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр).

1.3. Конкурс праводзіцца ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

першы этап (адборачны) – ва ўстановах адукацыі, у тым ліку ва ўстановах адукацыі абласнога, Мінскага гарадскога падпарадкавання;

другі этап (адборачны) – раённы, у тым ліку для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне, гарадскі (акрамя г. Мінска);

трэці этап (адборачны) – абласны, Мінскі гарадскі. На дадзеным этапе могуць прымаць удзел установы адукацыі абласнога і Мінскага гарадскога падпарадкавання;

чацвёрты (заключны) – рэспубліканскі.

1.4. Для правядзення конкурсу на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсу;

даводзіць інфармацыю аб конкурсе да ведама ўстаноў адукацыі;

вызначае месца і канкрэтныя даты правядзення адпаведнага этапу конкурсу;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсу і зацвярджае яго ва ўстаноўленым парадку;

аналізуе і зацвярджае вынікі конкурсу;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсу ў сродках масавай інфармацыі.

У склад аргкамітэтаў могуць уваходзіць прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, устаноў адукацыі і іншых арганізацый.

1.5. Для падвядзення вынікаў конкурсу на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы, якое:

праводзіць ацэнку конкурсных работ;

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсу;

прадстаўляе пратаколы па выніках конкурсу ў адпаведныя аргкамітэты.

1.6. Удзельнікамі конкурсу з'яўляюцца асобныя навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ва ўзроставай катэгорыі 13 – 18 гадоў.

2. **Асаблівасці правядзення конкурсу**

2.1. Конкурс праводзіцца з снежня 2025 года па сакавік 2026 года.

2.2. Асноўныя мэта і задачы конкурсу

Конкурс праводзіцца з мэтай фарміравання ў дзяцей і навучэнскай моладзі грамадзянска-патрыятычных пачуццяў сродкамі экскурсійнай музейнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляюцца:

фарміраванне ў дзяцей і моладзі каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі і культуры малой радзімы;

папулярызацыя гісторыка-культурных і прыродных адметнасцей малой радзімы сродкамі экскурсійнай дзейнасці;

папулярызацыя дзейнасці музеяў устаноў адукацыі;

выяўленне і заахвочванне лепшых юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі;

развіццё творчых здольнасцей, садзейнічанне прафесійнаму самавызначэнню навучэнцаў, набыццё камунікатыўных навыкаў праз экскурсійную дзейнасць.

2.3. У конкурсе ўдзельнічаюць юныя экскурсаводы музеяў устаноў адукацыі (індывідуальна).

2.4. На кожным этапе адбіраецца пераможца ад кожнага профілю музея: гістарычны (ваенна-гістарычны, агульнагістарычны, этнаграфічны,

гістарычны манаграфічны), літаратурны, краязнаўчы, прыродазнаўчы, мастацкі.

Фармат правядзення першага і другога этапу вызначаецца арганізатарамі правядзення конкурсу адвольна.

Трэці этап конкурсу рэкамендуецца праводзіць у вочным фармаце. Пераможцы (па аднаму ў кожным профілі, не больш 8 юных экскурсаводаў) удзельнічаюць у рэспубліканскім (заключным) этапе.

2.5. Рэспубліканскі (заключны) этап складаецца з двух тураў.

У першым туры (завочны) удзельнікі конкурсу прадстаўляюць відэаролік «Тры прычыны зазірнуць у музей» (да 5 хвілін). У відэароліку юныя экскурсаводы ствараюць уласны наратыў вакол музейных матэрыялаў, раскрываюць тры значныя прычыны наведаць музей, дэманструюць навыкі музейнай камунікацыі.

У другім туры (вочны) удзельнікі конкурсу прадстаўляюць (у адпаведнсці з профілем музея) аглядную экскурсію «Голас з мінуўшчыны» (да 7-мі хвілін). Удзельнікі конкурсу знаёмяць з музеем установы адукацыі ад імя асобы імі выбранага персанажа. Персанажам можа быць любы чалавек мінулага, чые лёс, прафесія, або дзейнасць маюць прамое дачыненне да музейных матэрыялаў і якія могуць дапамагчы юным экскурсаводам зрабіць выступленне эмацыйна яркім.

Колькасць аб'ектаў падчас правядзення экскурсіі не абмяжоўваецца. Пры правядзенні экскурсіі могуць выкарыстоўвацца розныя мастацкія сродкі эмацыйнага ўздзеяння (касцюмы, музычнае суправаджэнне і інш.).

2.6. Асноўныя крытэрыі ацэнкі.

2.6.1. Крытэрыі ацэнкі першага тура (відэаролікаў):

значнасць прадстаўленных прычын для наведвання музея;

змест і інфарматыўнасць;

лагічнасць і цэласнасць наратыву;

камунікатыўныя навыкі, уменне захапіць увагу гледача, выразнасць мовы;

выкарыстанне візуальных сродкаў (мантаж, музыка, цітры і г.д.);

адпаведнасць хранаметражу.

2.6.2. Крытэрыі ацэнкі другога тура (агляднай экскурсіі):

пераканаўчасць увасаблення персанажа;

цэласнасць вобраза (манера паводзін, мова, касцюм);

артыстызм, эмацыйная выразнасць;

змястоўнасць, інфарматыўнасць;

лагічнасць пераходаў для аб'яднання матэрыялу экскурсіі ў адзінае цэлае;

выкарыстанне мастацкіх сродкаў эмацыйнага ўздзеяння;

камунікатыўныя навыкі, кантакт з аўдыторыяй, уменне трымаць увагу;

спалучэнне паказа і расказа;

цэласнасць і завершанасць экскурсійнага прадстаўлення;

арыгінальнасць задумы і яе рэалізацыі;

прытрымліванне хранаметражу.

2.7. Пратаколы пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў рэгіянальных этапаў конкурсу, а таксама матэрыялы (відэаролікі) першага тура рэспубліканскага этапу дасылаюцца да 10 сакавіка 2026 года (у электронным варыянце) на e-mail: belarusunitur@rcek.by. Тэлефон для даведак: 8017 3200633.

2.8. Персанальная адказнасць за накіраванне індывідуальных удзельнікаў на заключны этап рэспубліканскага конкурсу ўскладаецца на кіраўніка структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

2.9. Аўтары, удзельнікі конкурсу, даюць згоду арганізатарам адпаведных этапаў правядзення конкурсу на публічную дэманстрацыю работ на сайтах арганізатараў, некамерцыйнае выкарыстанне матэрыялаў з мэтай папулярызацыі (з захаваннем аўтарскіх правоў).

## 3. Падвядзенне вынікаў конкурсу

Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаюцца па суме балаў першага і другога тураў.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу пры роўнай колькасці балаў на падставе рашэння журы можа ўсталёўвацца адпаведная колькасць прызавых месцаў (першае, другое, трэцяе).

Пераможцы і прызёры заключнага этапу конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені і прызамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дыпломамі Рэспубліканскага цэнтра.

## 4. Фінансаванне конкурсу

Фінансаванне конкурсу ажыццяўляецца:

на першым этапе – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, прадугледжаных установам адукацыі на іх функцыянаванне, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

на другім і трэцім этапах – ва ўстаноўленым парадку за кошт мясцовых бюджэтаў, прадугледжаных на правядзенне адукацыйных і іншых мерапрыемстваў, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

на чацвёртым (заключным) этапе – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія прадугледжваюцца Міністэрству адукацыі на правядзенне адукацыйных і іншых мерапрыемстваў, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Приложение 2
к приказу начальника главного
управления образования
от 05.01.2026 № 1

СОСТАВ
ОРГАНИЗАЦИОННОГО КОМИТЕТА
областного этапа конкурса
юных экскурсоводов музеев
учреждений образования

| | | |
|---|---|---|
| Дробов А.В. | – | главный специалист отдела воспитательной и социальной работы главного управления образования Гомельского облисполкома; |
| Морозов А.Л. | – | директор ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи», председатель жюри; |
| Слаута А.В. | – | заведующий краеведческим отделом ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи». |

Приложение 3
к приказу начальника главного
управления образования
от 05.01.2026 № 1

СОСТАВ ЖЮРИ
областного этапа конкурса
юных экскурсоводов музеев
учреждений образования

| | | |
|---|---|---|
| Морозов А.Л | – | директор ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи», председатель жюри; |
| Писаренко О.В. | – | заместитель директора по учебно-воспитательной работе ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи»; |
| Слаута А.В. | – | заведующий краеведческим отделом ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи»; |
| Певец Д.Ю. | – | педагог-организатор краеведческого отдела ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи»; |
| Щербакова А.Л. | – | методист краеведческого отдела ГУО «Гомельский областной центр туризма и экологии детей и молодёжи»; |
| Купреева Ю.С. | – | заведующий филиалом «Музей истории города Гомеля» (по согласованию); |
| Сачук В.М. | – | заведующий Гомельским филиалом ГУК «Ветковский музей старообрядчества и белорусских традиций имени Ф.Г.Шклярова» (по согласованию). |

Приложение 4
к приказу начальника главного
управления образования
от 05.01.2026 №1

# ЗАЯВКА
## на участие в областном этапе республиканского конкурса юных экскурсоводов музеев учреждений образования

| Полное название учреждения образования (без сокращения) | Полное название музея учреждения образования (без сокращения), профиль | Фамилия Имя юного экскурсовода | Возраст, класс | Ф.И.О. руководителя музея, телефон | Ссылка на видеозапись экскурсии «Три причины посетить музей» (до 5 минут) | Ссылка на видеозапись обзорной экскурсии (до 7 минут) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

Руководитель отдела, управления,
учреждения образования областного подчинения _____ _____
МП подпись Ф.И.О
«_____» _____ 2026 г.